

# ПРЭЗІДЭНТ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ДУШАНБЭ

**Новы крок у гісторыі СНД, якая не спыняецца ў сваім развіцці**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 196 (30584)



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# БЛІЗКА ДА СЭРЦА

**Беларускія кардыяхірургі выконваюць поўны спектр аперацый, як і ў найлепшых сусветных клініках**

Днямі ў РНПЦ «Кардыялогія» праведзена 39-я сёлета трансплантацыя сэрца. Яе выканалі 30-гадовай пацыентцы, якая знаходзілася ў лісце чакання некалькі апошніх месяцаў. Донарскае сэрца было дастаўлена з Бярозы пры падтрымцы экіпажаў ДАІ Брэсцкай і Мінскай абласцей — і з дапамогай хірургаў выратавала жыццё маладой жанчыны. У нашай краіне праведзена ўжо 635 такіх аперацый, пачынаючы з 2009-га, калі донарскае сэрца было перасаджана ўпершыню. Некаторым пацыентам, а іх ужо чатыры, такія аперацыі выкананы паўторна, бо служыць донарскае сэрца 10—15 гадоў. Аднак трансплантацыя — гэта вяршыня хірургічнага майстэрства і апошняя надзея для пацыента. Часцей за ўсё палепшыць здароўе ўдаецца з дапамогай іншых аперацый — на ўласным сэрцы ці сасудах. У РНПЦ «Кардыялогія» магчымы ўвесь спектр хірургічных умяшанняў, якія выконваюцца ў лепшых сусветных клініках. А трапіць сюды могуць не толькі мінчане, але і жыхары з любога населенага пункта краіны.

СТАР. 8–9



З КІМ ЖЫЦЬ, ТАГО НЕ ГНЯВІЦЬ 10



САБРАЎ УРАДЖАЙ — ЗАХАВАЙ! 16



**+TV ПРАГРАМА**

«ДАМЫ ЗАПРАШАЮЦЬ КАВАЛЕРАЎ»

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

# ГРУЗЫ ІДУЦЬ НА ЎСХОД

**Транспартны сектар Беларусі застаецца адным з ключавых элементаў нацыянальнай эканомікі**

Самыя складаныя свае часы галіна міжнародных грузавых аўтамабільных перавозак ужо перажыла — спачатку з ковіднымі абмежаваннямі, затым з санкцыямі з боку краін ЕС, якія, дарэчы, не слабеюць і сёння. Перавозчыкі ў гэтай сітуацыі выбралі адзіна правільны шлях — працаваць па новых напрамках, шукаць новых партнёраў і распрацоўваць эфектыўныя стратэгіі і маршруты. Значную дапамогу ў пераадоленні цяжкасцяў ім аказваў і працягвае аказваць урад краіны — двухбаковыя сустрэчы, перагаворы, ратыфікаваныя пагадненні — усё гэта дазваляе не толькі трымаць на плаву экспарт транспартных паслуг, але і нарошчваць яго.



СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

# ПРЭЗІДЭНТ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ДУШАНБЭ

## Новы крок у гісторыі СНД, якая не спыняецца ў сваім развіцці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам адправіўся ў Таджыкістан. Галоўная мэта — удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое запланавана на 10 кастрычніка.**




Фота БелТА.

У аэрапорце Душанбэ беларускага лідара сустракалі прэм'ер-міністр Таджыкістана Кахір Расулзада, міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў, пасол Беларусі ў Таджыкістане Віктар Дзенісенка і іншыя афіцыйныя асобы.

Парадак дня пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД даволі шырокі. На разгляд лідараў Садружнасці будзе вынесена каля двух дзясяткаў пытанняў. У наступным годзе СНД адзначыць знакавую дату — 35-годдзе з дня ўтварэння. І сёння актуальным бачыцца ўмацаванне яе міжнароднага пазіцыянавання, у прыватнасці ініцыятыва стварэння фармату «СНД плюс» і прадастаўлення Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва статусу назіральніка пры СНД. Гэта пытанне вынесена на абмеркаванне падчас пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў.

На парадку дня таксама тэматыка энергетычнай бяспекі, супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, у галіне пагранічнай бяспекі, барацьбы з транснацыянальнай злачыннасцю. Адзін з найбольш значных для Беларусі пунктаў — заява кіраўнікоў дзяржаў СНД у сувязі з маючым адбыцца 40-годдзем катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Будуць абмеркаваны скаардынаваныя дзеянні краін Садружнасці пры разглядзе дадзенай тэмы на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Асобную ўвагу ўдзельнікі пасяджэння ўдзеляць пытанням бягучай дзейнасці СНД. Па выніках мерапрыемства плануецца прыняць адпаведныя міжнародныя дакументы.

Некаторыя з іх закранаюць праблематыку супрацоўніцтва ў галіне бяспекі. На саміце ў Душанбэ, у прыватнасці, плануецца зацвердзіць праграмы супрацоўніцтва ў сферы процідзеяння тэрарызму і экстрэмізму на 2026—2028 гады, а таксама ва ўмацаванні пагранічнай бяспекі на знешніх граніцах на 2026—2030 гады, канцэпцыю ваеннага супрацоўніцтва да 2030 года. Чакаецца, што кіраўнікі дзяржаў падпішуць дэкларацыю аб супрацоўніцтве ў сферы забеспячэння рэгіянальнай энергетычнай бяспекі, якая накіравана на аб'яднанне намаганняў у сістэмным развіцці энергетычнага комплексу як падмурка ўстойлівага функцыянавання эканомікі, сацыяльнай стабільнасці і нацыянальнай бяспекі ва ўмовах глабальных выклікаў і імклівых змяненняў у сусветнай кан'юнктуры. Лідары СНД таксама маюць намер прыняць шэраг заяў — аб супрацоўніцтве ў барацьбе з транснацыянальнай злачыннасцю; аб супрацьдзеянні адмываванню даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансаванню тэрарызму і распаўсюджванню зброі масавага знішчэння; у сувязі з 40-годдзем катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і з нагоды 80-й гадавіны стварэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**
>
> *«Механізм узаемадзеяння ў рамках СНД — найважнейшы інструмент умацавання палітычнай і эканамічнай сілы дзяржаў Садружнасці і рэгіёна ў цэлым. У СНД нямала краін, якія маюць найвялікшы патэнцыял. Гэта багатыя дзяржавы. Багатыя тымі рэсурсамі, у якіх сёння вельмі мае патрэбу ўся планета.*
>
> *Мы сталі на плячах некалькіх пакаленняў, якія здолелі ў свой час фактычна з нуля стварыць магутную дзяржаву, якая стала адным з геапалітычных цэнтраў сілы. Яна фарміравалася на агульнасці мэт і павазе традыцый і культур нашых народаў. Таму была моцнай. Аналагаў савецкага досведу нацыянальнага будаўніцтва ў гісторыі няма.*
>
> *У сувязі з гэтым няма нічога дзіўнага ў тым, што новае аб'яднанне цяпер ужо суверэнных дзяржаў непажаданае ў цяперашняй геапалітычнай канфігурацыі. Мы гэта заўсёды ведалі, таму зрабілі ўсё, каб захаваць такую ўнікальную мадэль, што нам удалося. Паглядзіце: Савецкага Саюза даўно няма, а спробы дэманізацыі савецкага мінулага на Захадзе не спыняюцца. Там прадаўжаюць барацьбу з прывідам. Пра што гэта гаворыць? Пра сілу гістарычнага адзінства нашых народаў, якая да гэтага часу трывожыць і Вашынгтон, і Брусель».*
>
> **На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у Маскве, 8 кастрычніка 2024 года.**

### Даслоўна

### Не толькі перагаворная пляцоўка аднадумцаў

Міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў у размове з журналістамі адзначыў, што гэты саміт асаблівы, і растлумачыў, чаму. «Ён мае значэнне не толькі як перагаворная пляцоўка аднадумцаў, тых, хто ўзначальвае краіны СНД, у падобных умовах будуе сваю незалежнасць і таму выбудоўвае супрацоўніцтва ў рамках гэтай міжнароднай арганізацыі па цэлым комплексе кірункаў», — падкрэсліў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. Максім Рыжанкоў звярнуў увагу, што Садружнасць была заснавана амаль 35 гадоў таму і за гэты час набыла рысы сур'ёзнай міжнароднай арганізацыі. Тым не менш СНД не спыняецца ў сваім развіцці, чаму ёсць цэлы шэраг пацвярджэнняў. У прыватнасці, на маючым адбыцца саміце будуць узнімацца пытанні аб пашырэнні магчымасцяў для новых удзельнікаў, аб статусе іншых дзяржаў пры СНД.

«Далей будуць рашэнні па больш сур'ёзным міжнародным пазіцыянаванні СНД. Абмяркуюцца пытанні супрацоўніцтва з іншымі рэгіянальнымі арганізацыямі, нададання статусу назіральніка Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — падкрэсліў міністр замежных спраў Беларусі. Знакавым пытаннем, якое будзе разгледжана на саміце, Максім Рыжанкоў назваў фармат «СНД плюс».

«Пытанне «СНД плюс» адлюстроўвае неабходнасць выбудоўвання больш комплексных і цесных адносін — перш за ўсё ў рэгіянальным аспекце. Краіны, якія імкнуцца да нашага рэгіёна, вядома ж, хочуць быць у курсе таго, што адбываецца ў нашай арганізацыі, і ўдзельнічаць у вырашэнні пытанняў», — лічыць міністр. Ён звярнуў увагу і на той факт, што з СНД лічацца іншыя арганізацыі — напрыклад, ААН і ШАС. «Мы рухаемся ў правільным кірунку. Аўтарытэт арганізацыі расце», — упэўнены Максім Рыжанкоў.







# СІНЕРГІЯ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**СНД рыхтуецца пашырыць свой уплыў? Расказваем, у чым асаблівасць саміту Садружнасці ў Душанбэ**

У кастрычніку сталіца Таджыкістана прымае саміт Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Лідарам СНД трэба будзе разгледзець каля двух дзясяткаў пытанняў, але адно з іх заслугоўвае асаблівай увагі. Савет кіраўнікоў дзяржаў мае намер заснаваць фармат «СНД плюс», які прадугледжвае ўдзел трэціх краін у рабоце аб'яднання. Такі фармат узаемадзеяння з партнёрамі ўжо добра зарэкамендаваў сябе ў ШАС і БРІКС. І СНД, мяркуючы па ўсім, вырашыла пераняць іх вопыт. Ці дазволіць гэта арганізацыі пашырыць уплыў у рэгіёне і павысіць аўтарытэт на міжнароднай арэне? Давайце разбірацца.

Садружнасць Незалежных Дзяржаў — самае вялікае і, бадай, самае вядомае інтэграцыйнае аб'яднанне на постсавецкай прасторы. Першапачаткова яно ствралася для рэгулявання адносін паміж рэспублікамі былога СССР. Не ўсе з іх далучыліся да гэтай арганізацыі. Некаторыя з часам адмовіліся ад удзелу або прыпынілі сваё сяброўства. Але большасці краін хапіла мудрасці захаваць гэта адзінства. І цяпер на першы план выходзіць не супрацоўніцтва ў фармаце «закрытага клуба», а пашырэнне яго зоны ўплыву. У СНД ёсць права, а можа, нават і абавязак стаць аўтарытэтным гульцом на міжнароднай арэне.

І гэтыя пытанні ўжо абмяркоўваліся. Напрыклад, пару гадоў таму на саміце ў Бішкеку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўжо цяпер у многіх пасяджэннях органаў Садружнасці ўдзельнічаюць прадстаўнікі розных міжнародных арганізацый, а значыць, прыйшла пара рухацца далей.

***– Беларусь заўсёды была прыхільнікам спалучэння дзейнасці міжнародных інтэграцыйных аб'яднанняў з сугучнымі мэтамі і задачамі. Базавая ўмова — мы павінны падтрымліваць адно аднаго, а не ствараць перашкоды. Мяркую, што для дзяржаў — удзельніц Садружнасці могуць быць цікавымі ўжо наяўныя напрацоўкі па лініі іншых нашых фарматаў, напрыклад па такіх важных тэмах, як электронны гандаль, шырокае ўкараненне лічбавых тэхналогій, доступ да дзяржаўных закупак, зніжэнне тарыфаў тэлефоннай сувязі ў роўмінгу і многіх іншых кірунках, — заявіў беларускі лідар.***

Тады, на саміце ў Бішкеку, кіраўнікі дзяржаў вырашылі заснаваць статус назіральніка пры СНД і партнёра Садружнасці. Гэта стварыла асновы для прававога рэгулявання такіх адносін. Работа ў гэтым кірунку ўжо прынесла першыя вынікі. Чакаецца, што на саміце ў Душанбэ статус назіральніка пры СНД будзе прадастаўлены Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Сваё рашэнне працаваць з СНД члены ШАС афіцыйна агучылі 1 верасня ў кітайскім Цяньцзіні.

## ШТО АЗНАЧАЕ ФАРМАТ «СНД ПЛЮС»

Фармат «СНД плюс» быў ініцыіраваны Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым літаральна год таму на саміце Садружнасці ў Маскве. Паводле яго слоў, гэта пляцоўка стане асновай для пашырэння рэгіянальных сувязяў.

— Аўтарытэт СНД на сусветнай арэне расце. Летась былі заснаваны статусы назіральніка і партнёра СНД, што прадэманстравала адкрытасць і сталасць нашай арганізацыі. У працяг гэтай інстытуцыйнай работы прапаную разгледзець пытанне ўстановы фармату «СНД плюс», — сказаў казахстанскі лідар.

Гэту ініцыятыву падтрымала і Беларусь.

***— Беларусь вітае ініцыятыву нашых казахстанскіх калег аб стварэнні фармату «СНД плюс» у якасці новай платформы шматбаковага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці з міжнароднымі партнёрамі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка на нядаўняй сустрэчы з кіраўнікамі ўрадавых дэлегацый СНД.***

Возьмем, напрыклад, СНД і ШАС. У гэтых арганізацый ёсць шмат пунктаў судакранання. У той жа гуманітарнай плоскасці. Акрамя таго, для абодвух аб'яднанняў важная барацьба з тэрарызмам, наркагандлем і незаконнай міграцыяй. Не варта забываць і пра эканамічныя аспекты: праекты па лініі СНД маглі б знаходзіць свой працяг за межамі Садружнасці. Так што цалкам відавочна, што многія азіяцкія краіны атрымаюць пэўную выгаду ад далучэння да платформы «СНД плюс».

## НАВОШТА СНД РАЗВІВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ААН

У жніўні на Генеральнай Асамблеі была прынятая рэзалюцыя аб супрацоўніцтве паміж ААН і СНД. У дакуменце адзначана дзейнасць Садружнасці Незалежных Дзяржаў па ўмацаванні рэгіянальнага супрацоўніцтва ў такіх галінах, як гандаль і эканамічнае развіццё, абмен статыстычнымі данымі і эканамічнай інфармацыяй, культура, адукацыя, ахова здароўя, спорт, турызм, навука і інавацыі, ахова навакольнага асяроддзя і барацьба з прыроднымі і тэхнагеннымі катастрофамі, процідзеянне арганізаванай злачыннасці і незаконнаму абароту наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, актам тэрарызму, праявам экстрэмізму і нелегальнай міграцыі, у іншых звязаных з гэтым абласцях.

У рэзалюцыі падкрэсліваецца, што ўмацаванне супрацоўніцтва паміж ААН і СНД будзе спрыяць прасоўванню мэт і прынцыпаў Сусветнай арганізацыі. Іншымі словамі, СНД застаецца надзейным партнёрам для арганізацыі Аб'яднаных Нацый па забеспячэнні міжнароднага міру і бяспекі, устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і ажыццяўленні правоў чалавека.

## ГАЛОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ ДЛЯ СНД ЗАСТАЕЦЦА ЭКАНОМІКА

Чаму, калі мы гаворым аб міжнародным аўтарытэце і ўплыве на сусветнай арэне, галоўнай задачай для СНД па-ранейшаму называецца эканоміка? Усё проста: эканоміка — аснова ўсяго. Толькі на гэтым падмурку можна пабудаваць сапраўднае лідарства.

На сустрэчы з кіраўнікамі ўрадаў СНД, якую мы ўжо згадвалі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ва ўмовах цяперашняга перадзелу свету і вострай канкурэнтнай барацьбы выстаяць можна толькі разам.

***— Я скажу проста, па-зямному: давайце не страцім тое, што напрацавана папярэднімі пакаленнямі нашых людзей. Давайце захаваем тое, што ў нас ёсць, — нашы эканамічныя адносіны, наш эканамічны падмурак. Давайце трымацца адно за аднаго цяпер. Давайце не будзем бегчы ў розныя бакі, — заклікаў беларускі лідар. — Ніхто нідзе нас не чакае. Галоўнае — наша адзінства, захаваць тое, што напрацавана ранейшымі пакаленнямі, тое, што ў нас ёсць.***

Цэнтральная роля ў гэтых працэсах належыць Расіі, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

***— Яна павінна зрабіць галоўны ўнёсак, каб склеіць, аб'яднаць, не даць разваліцца ў гэты час нашым саюзам. Яна павінна адыграць у гэтым плане сваю ролю. А мы павінны не проста дэманстраваць, а рухацца ў гэтым кірунку, — заявіў Прэзідэнт Беларусі. — Галоўнае — гэта эканоміка. Давайце падтрымліваць яе на самым высокім узроўні. Давайце перш за ўсё будзем бачыць нашы краіны ў рэалізацыі тых ці іншых праграм, кантрактаў, кірункаў развіцця той ці іншай дзяржавы, падтрымліваць, наколькі мы можам, адно аднаго. У аснову трэба пакласці справядлівасць і шчырасць, раўнапраўе нашых адносін.***

Дарэчы, другі год запар тэмпы росту ВУП у дзяржавах СНД перавышаюць сярэднесусветныя. Такая тэндэнцыя, па словах Прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Турчына, наглядна пацвярджае атрыманне канкрэтных выгод кожнай краінай ад эканамічнай інтэграцыі ў Садружнасці. Аднак, перакананы кіраўнік беларускага ўрада, нельга спыняцца на дасягнутым і ігнараваць турбулентнасць на сусветным рынку.

Апошнім часам шмат гаворыцца аб глабальнай большасці. Краіны, якія адносяць сябе да гэтага вызначэння, імкнуцца да супрацоўніцтва на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемавыгады. Без дыктату і пагроз, незаконных абмежаванняў і прымусу. Адным з лідараў гэтых працэсаў стала Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — і непасрэдна сам Кітай. Сур'ёзным удзельнікам геапалітычных трансфармацый можа быць і СНД.

На думку Прэзідэнта Беларусі, Садружнасць Незалежных Дзяржаў павінна замацавацца як аўтарытэтная, уплывовая арганізацыя, якая на справе спрыяе ўмацаванню раўнапраўных адносін у палітычнай і гуманітарнай сферах. Беларусь жа будзе і далей актыўна садзейнічаць умацаванню партнёрства паміж краінамі і развіццю інтэграцыі ва ўсіх формах.

**Паводле БелТА.**





**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1: сеялка зерновая KUHN ESPRO R6000C, год выпуск 2017 г., инвентарный номер БП-004530**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 26 960,00 | Размер задатка, руб. | 2 696,00 |
|---|---|---|---|

**Местоположение объекта:** Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новосёлки, ул. Центральная, 14. **Продавец:** ОАО «Путь новый», 225374, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новосёлки, ул. Центральная, 14, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости продажи с НДС (20 %) в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. **Срок передачи недвижимого имущества:** в течение 3 (трех) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости Объекта. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 29 октября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 октября 2025 г. до 17.00**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Санаторий «Озерный»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 19.11.2025.**

**Лот № 1:** МЕРСЕДЕС-БЕНЦ 0560, NMB61336513230106, 2000 г. в.

Начальная цена с НДС 20 % – 70 699,00 руб.
Задаток – 7 070,00 руб.

**Местонахождение:** Гродненская обл., аг. Озеры.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **17.11.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «ДОРОРС»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 23.10.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:** Магазин с инв. № 151/С-13375. Площадь – 99,2 кв. м.

Адрес: Брестская обл., Ганцевичский р-н, Люсинский с/с, аг. Люсино, ул. Привокзальная, 28.
Земельный участок № 121681705102000469, 0,0353 га.
Право постоянного пользования.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена с НДС 20 % – 6 000,00 руб.
Задаток – 100,00 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **21.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• e-mail: torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182


# «АПОРА, ЯКАЯ РОБІЦЬ НАШУ КРАІНУ МОЦНАЙ»

## Аляксандр ТУРЧЫН уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер

У чацвер у Палацы Рэспублікі адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод прадстаўнікам аграпрамысловага комплексу, прамысловасці, будаўніцтва, сувязі, транспарту, энергетыкі, сферы сацыяльнай абароны, адукацыі, культуры і спорту. Адпаведныя распараджэнні і ўказы аб узнагароджанні падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын выступіў з віншаваннямі і ўручыў узнагароды найлепшым супрацоўнікам розных сфер — а гэта больш за 50 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны.



Сярод узнагароджаных — прадстаўнікі самых розных прафесій. Усе тыя, хто штодзённай самаадданай працай і талентам робіць наша жыццё і нашу краіну лепшымі. Іх праца — не проста фармальнае выкананне абавязкаў, а гонар і прыклад для наступных пакаленняў. Стаж многіх адзначаных узнагародамі налічвае некалькі дзясяткаў гадоў.

**«Сёння мы ўшаноўваем тых, чыя праца робіць рэальны ўнёсак ва ўмацаванне эканомікі і сацыяльнай сферы нашай краіны, — звяртаючыся да прысутных, падкрэсліў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. — Сярод узнагароджаных — прадстаўнікі аграпрамысловага комплексу, прамысловасці, будаўніцтва, аховы здароўя, адукацыі, культуры і многіх іншых галін».**

Кіраўнік урада адзначыў, што за кожнай з узнагарод стаіць гісторыя самаадданай працы тых, хто сваім прыкладам даказвае: сіла Беларусі — у яе людзях. «Вы — той падмурак, тая апора, якая робіць нашу краіну моцнай. Высокая дзяржаўная ўзнагарода — гэта не толькі пашана і павага. Гэта і вялікая адказнасць — быць прыкладам для іншых, асабліва для маладога пакалення. Паказваць, што значыць любіць сваю Радзіму не на словах, а на справе, што якасная і добрасумленная праца, вернасць абавязку і гатоўнасць прыйсці на дапамогу — тыя каштоўнасці, якія фарміруюць стрыжань нашай нацыі» — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Ад імя ўрада і ад сябе асабіста Прэм'ер-міністр Беларусі павіншаваў прысутных з гэтай знамянальнай падзеяй, а таксама падзякаваў за працу.





**«Вашы дасягненні натхняюць, усяляюць гонар за нашу краіну і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Жадаю моцнага здароўя, новых сіл для рэалізацыі самых смелых планаў, дабрабыту вам і вашым блізкім», — сказаў кіраўнік беларускага ўрада.**

Вялікая група работнікаў удастоена медаля «За працоўныя заслугі». У іх ліку — прадстаўнікі МАЗа, холдынга «БелОМА», «Белпошты», ААТ «БАТЭ» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты», Беларускай універсальнай таварнай біржы, Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і інш.

Медалём узнагароджана і рэктар Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі (г. Гомель) Святлана Лебедзева. Яна выказала асаблівую падзяку свайму працоўнаму калектыву. «Асноўны лозунг нашага ўніверсітэта — будзь творцам эканомікі поспеху. У гэтай зале сёння сабраліся тыя, хто сапраўды робіць свой унёсак у інавацыйнае ўстойлівае развіццё краіны», — адзначыла яна.

Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны — артыст балета Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» Алена Багданава, дырэктар сярэдняй школы № 1 г. Баранавічы імя С. І. Грыцаўца Марына Купцова, першы намеснік галоўнага рэдактара газеты «Гомельская праўда» Вячаслаў Мінкоў, настаўнік фізікі сярэдняй школы № 14 г. Маладзечна Алена Спецыян і іншыя.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ

# У АДКАЗЕ ЗА ЗАХАВАННЕ МІРУ І СТАБІЛЬНАСЦІ

## У Мінску адбылося 25-е пасяджэнне Маладзёжнай міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД

Мерапрыемства, якое ўпершыню праходзіла ў Беларусі, прысвечана 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.


Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.

Таму надзвычай сімвалічным з'яўляецца наведванне маладымі парламентарыямі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Праграма іх знаходжання ў нашай рэспубліцы вельмі змястоўная і насычаная: знаёмства з дзейнасцю членаў Савета Рэспублікі, магчымасцямі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, удзел у рэалізацыі міжнароднай акцыі «Лічбавая зорка».

Падчас пасяджэння Маладзёжнай міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД прадстаўнікі парламентаў Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана расказалі аб тым, як моладзь у іх краінах захоўвае гістарычную памяць аб Перамозе. Таксама былі абмеркаваны пытанні развіцця маладзёжнага парламентарызму і міждзяржаўных праектаў у гуманітарнай сферы.

Члены Асамблеі азнаёміліся з вопытам Беларусі ў справе развіцця маладзёжнай палітыкі і маладзёжнага парламентарызму на сучасным этапе. Акрамя таго, удзельнікі мерапрыемства разгледзелі маладзёжныя праекты, якія атрымалі шырокую падтрымку на прасторы СНД: «Лічбавая зорка», патрыятычны рух «Перамога 9/45», міжнародны праект «Маладзёжная сталіца СНД».

Маладзёжная міжпарламенцкая асамблея СНД прыняла зварот да моладзі СНД у сувязі з 80-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў.

«Сёння, калі робяцца спробы скажэння гісторыі, фальсіфікацыі вынікаў Другой сусветнай вайны, апраўдання злачынстваў нацызму, а таксама адбываюцца абуральныя выпадкі апаганення і дэмантажу помнікаў героям Вялікай Айчыннай вайны, мы рашуча асуджаем падобныя дзеянні і заяўляем аб нашай нязменнай прыхільнасці абароны гістарычнай праўды і захаванню памяці аб подзвігу пераможцаў», — гаворыцца ў звароце.

Звяртаючыся да моладзі краін СНД, маладыя парламентарыі заклікалі памятаць подзвіг продкаў, ганарыцца ім і берагчы ад забыцця. Яны падкрэслілі: веданне гісторыі, павага да культуры і традыцый суседзяў, сяброўства паміж народамі — усё гэта аснова трывалага міру. Парламентарыі лічаць важным не толькі вывучаць мінулае, але і ўдзельнічаць у яго захаванні: даглядаць мемарыялы, дапамагаць ветэранам, збіраць сямейныя гісторыі, уключацца ў пошукавыя і добраахвотніцкія рухі, а таксама адстойваць праўду ў лічбавай прасторы.

На сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай маладыя парламентарыі дзяржаў — удзельніц СНД абмеркавалі будучыню СНД у кантэксце тэхналогій і маладзёжных ініцыятыў.

Генеральны сакратар Савета МПА СНД Дзмітрый КАБІЦКІ пасля сустрэчы з удзельнікамі Маладзёжнай міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД у Савеце Рэспублікі адзначыў, што сучасная моладзь вельмі актыўная і пазітыўная. «Аднак пытанні, якія ўзнімаюцца на пасяджэннях моладзі міжпарламенцкай асамблеі, маюць зусім дарослы характар, — удакладніў ён. Размова ідзе і аб звароце, які прысвечаны 80-годдзю Перамогі, і аб пытаннях маладзёжнай палітыкі ў кожнай з краін Садружнасці».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# КАНСАЛІДАЦЫЯ ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў унеслі прапановы па дапрацоўцы праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады

Нагадаем, згодна з распараджэннем Прэзідэнта, створана рабочая група па дапрацоўцы гэтага найважнейшага дакумента, які вызначыць прыярытэты нашай краіны на будучую пяцігодку.


Фота БелТА.

У склад рабочай групы ўвайшлі дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, дзеючыя і былыя кіраўнікі органаў дзяржаўнай улады, арганізацый рэальнага сектара эканомікі, навуковых і грамадскіх арганізацый. Кіраўніком рабочай групы прызначаны старшыня праўлення Нацыянальнага банка Раман Галоўчанка.

Рабочай групе сумесна з урадам даручана дапрацаваць праект праграмы. Да 1 лістапада работа над дакументам павінна быць завершана, аб яе выніках будзе праінфармаваны кіраўнік дзяржавы. У далейшым праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады ўпершыню будзе вынесены на разгляд дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу.

У цяперашні час вядзецца інтэнсіўная работа па дапрацоўцы, напаўненні дакумента. У гэтым працэсе без перабольшання задзейнічаны найлепшыя інтэлектуальныя сілы краіны. Сярод іх — дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Будучы ў цесным кантакце з людзьмі, народныя выбраннікі транслююць грамадскую думку, што дазваляе выявіць магчымыя слабыя месцы ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, падказаць разумныя механізмы выканання пастаўленых задач і дасягнення мэт.

«Людзі ведаюць, што Прэзідэнт даручыў дапрацаваць праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады, а таму праз сваіх прадстаўнікоў, дэпутатаў у выбарчых акругах агучваюць пытанні, якія, па іх меркаванні, павінны быць адлюстраваны ў гэтым дакуменце, — звяртае ўвагу **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Віктар НІКАЛАЙКІН**. — Вельмі важна, каб праграма адлюстроўвала чаканні людзей, адпавядала асновам сацыяльнай дзяржавы. А для таго, каб мець сацыяльную дзяржаву, нам патрэбна моцная эканоміка. Таму мы ставім высокія мэты і задачы, якія дазволяць напоўніць наш бюджэт і зрабіць нашу эканоміку моцнай. Тады мы будзем незалежнымі і ніякіх знешнія пагрозы нам не страшныя».

**Вераніка КАНЮТА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цен лота, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988237900, общ. пл. 47,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-125 | 186 601,70 |
| 2 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988237891, общ. пл. 48,0 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-132 | 188 542,94 |
| 3 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236246, общ. пл. 91,9 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-71 | 322 110,00 |
| 4 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236248, общ. пл. 81,1 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-75 | 284 220,00 |
| 5 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236250, общ. пл. 91,9 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-85 | 322 110,00 |
| 6 | **Квартира,** инв. № 500/D-7988236253, общ. пл. 91,8 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-92 | 321 750,00 |
| 7 | **Квартира,** инв. № 500/D-7988237888, общ. пл. 92 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-134 | 336 319,83 |
| 8 | **Квартира,** инв. № 500/D-7988237869, общ. пл. 91,9 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-148 | 336 319,83 |
| 9 | **Машино-место**, инв. № 500/D-7988227728, общ. пл. 13,7 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-26 | 16 020,00 с НДС |
| 10 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227729, общ. пл. 13,6 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-27. | 16 020,00 с НДС |
| 11 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227730, общ. пл. 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-35 | 16 020,00 с НДС |
| 12 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227731, общ. пл. 13,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-36 | 16 020,00 с НДС |
| 13 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227732, общ. пл. 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-37 | 16 020,00 с НДС |

**Задаток** (1 % от начальной цены лотов №№ 1-8, 5 % от начальной цены лотов №№ 9-13) в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 3 (три) рабочих дня** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 6 (шесть) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

**В случае несвоевременной оплаты предмета электронных торгов, согласно договору купли-продажи, Покупатель уплачивает пеню в размере 0,2 % от суммы неисполненных обязательств (невыплаченной суммы) по договору за каждый день просрочки платежа**

**В случае расторжения договора купли-продажи по инициативе Покупателя, Покупатель уплачивает Продавцу неустойку (штраф) в размере 15 000 белорусских рублей**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в «Звязда» от 11.09.2025 г., 28.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов. 21.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.10.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**ОАО «Санаторий «Озерный»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 24.10.2025.**

**Лот № 1:** AUDI A8,
WAUZZZ4EX5N010646, 2004 г. в.

Начальная цена с НДС 20 % – 17 566,26 руб.
Задаток – 1 757,00 руб.

**Местонахождение:** Гродненская обл., аг. Озеры.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **22.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;
torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Пятые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 12.09.2025 в газете «Звязда» № 176 (30564), стр. 5**

**Предмет электронного аукциона**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| **1** | Автотранспортный участок, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102 | 1 301 851,80 бел. руб. с учётом НДС 20 % | 260 370,36 бел. руб. с учётом НДС 20 % |
| | **Четвертые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 12.09.2025 в газете «Звязда» № 176 (30564), стр. 5** | | |
| **2** | Реактор химический с мешалкой, инв. № 3095, бывший в эксплуатации | 11 138,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 1 856,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| **3** | Реактор химический с мешалкой, инв. № 3096, бывший в эксплуатации | 11 138,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 1 856,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| | **Четвертые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 12.09.2025 в газете «Звязда» № 176 (30564), стр. 5** | | |
| **4** | Склад сажи, корпус № 35, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/24 | 150 278,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 25 046,40 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| | **Шестнадцатые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 12.09.2025 в газете «Звязда» № 176 (30564), стр. 5** | | |
| **5** | Дебиторская задолженность. Наименование дебитора: Акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва, Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт/пом/ком/оф 1/VII/А3Д, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012, ИНН: 7714887246, КПП: 771401001) | По цене исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 9 153,41 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов | По цене исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 915,34 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников электронного аукциона начальная цена электронного аукциона поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками электронного аукциона

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения электронного аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **1–4 % от цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 (три) дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 27.10.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 10.10.2025 по 24.10.2025 г. до 15.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Индивидуального предпринимателя МАКСИМОВОЙ Анжелы Александровны № 191520177 от 04.07.2012 **считать недействительным.**



# ГРУЗЫ ІДУЦЬ НА ЎСХОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



У 2025 годзе кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 155, які вызваляе ад утылізацыйнага збору новыя грузавыя аўтамабілі, прычэпы і паўпрычэпы экалагічнага класа 5 і вышэй, што выкарыстоўваюцца ў міжнародных перавозках. Калі канкрэтна, дакумент стварае дадатковыя ўмовы і дае магчымасць міжнародным перавозчыкам абнаўляць рухомы састаў. У рэчышчы дасягнутых дамоўленасцяў — лібералізацыя перавозак паміж Беларуссю і Расіяй і адмена дазволаў для двухбаковых і транзітных перавозак. Як усё гэта адбілася на дзейнасці беларускіх міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў і з якімі складанасцямі яны ўсё яшчэ сутыкаюцца па іншы бок граніцы — з гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да **эксперта па аўтаматызацыі працэсаў рынка лагістыкі Таццяны САЛДАЦЕНКА**.

## ТЭНДЭНЦЫІ ВЫЗНАЧАЕ РАСІЯ

***— Таццяна Віктараўна, як змяніліся актуальныя драйверы і напрамкі для айчыннай галіны аўтаперавозак?***

— У экспарце тэндэнцыі вызначае Расія. За студзень — жнівень гэтага года колькасць заявак на перавозкі ў Беларусь з гэтай краіны вырасла на 75 %. Нашым ключавым партнёрам па аб'ёмах перавозак была і застаецца Расія. Але калі казаць пра дынаміку, то самы вялікі рост паказаў Кітай — з плюсам у 236 %. Значна прыраслі пастаўкі з Узбекістана, Турцыі. За гэты ж перыяд Беларусь стала больш вазіць грузаў у Арменію, Казахстан і Расію — гэта дошкі, бытавая тэхніка, фанера, піламатэрыялы, прадукты харчавання, абсталяванне і запчасткі, вырабы з металу і іншае.

***— Увесну гэтага года кіраўнік Расійскай Федэрацыі падпісаў закон аб ратыфікацыі міжурадавага пагаднення паміж Расіяй і Беларуссю аб міжнародных аўтамабільных перавозках. Якія магчымасці адкрыў гэты дакумент перад беларускімі аўтаперавозчыкамі?***

— Закон прадугледжвае паэтапны пераход да бездазвольнальнай сістэмы перавозак. Фактычна гэта шлях да ўніфікацыі рынкаў міжнародных аўтаперавозак нашых краін. Пагадненне замацоўвае новы спрошчаны парадак перавозкі грузаў і прыбірае бюракратычныя бар'еры, у тым ліку і абмежаванні на кабатажныя перавозкі. Таму трэба чакаць, што дзякуючы ратыфікацыі гэтага закона перавозкі з краінай-суседкай стануць яшчэ прасцей і больш рэнтабельнымі, бо знізіцца колькасць неабходных для здзяйснення рэйса дакументаў і дазволаў — і, як следства, колькасць адміністрацыйных выдаткаў.

## ДОЎГАЧАКАНАЕ РАШЭННЕ: КАБАТАЖ УНУТРЫ РФ

***— Пытанне аб дазволе кабатажных перавозак беларускімі аўтаперавозчыкамі ўнутры Расіі абмяркоўвалася больш за два гады і ўрэшце вырашылася. Якія ўмовы пры ажыццяўленні гэтых перавозках ставяць для беларусаў усходнія суседзі?***

— Так, сапраўды, дазвол на кабатажныя перавозкі для кіроўцаў з краін ЕАЭС запрацаваў з 1 верасня 2025 года. Гэта вельмі доўгачаканае рашэнне для беларускіх перавозчыкаў — з ім паездкі ў Расію стануць больш рэнтабельнымі: цяпер, даставіўшы груз, кіроўца не вяртаецца дадому парожнім — на зваротным шляху ён можа зрабіць ад аднаго да трох рэйсаў паміж гарадамі Расіі. Такім чынам дазвол на кабатаж зробіць работу з Расіяй больш прыбытковай. Зразумела, ёсць пэўныя ўмовы для такіх перавозак. Адна з асноўных — кабатажная перавозка магчыма толькі ў выпадку завяршэння міжнароднага рэйса. Яшчэ адна — здзейсніць можна максімум тры паслядоўныя кабатажныя перавозкі па тэрыторыі Расіі, пры гэтым апошнюю з іх трэба завяршыць не пазней сямі дзён ад даты разгрузкі пры завяршэнні міжнароднага рэйса. Астатнія нюансы датычацца афармлення такой перавозкі.

## ДАРАГІ ТРАНЗІТ

***— Праз Казахстан праходзіць нямала транзітных маршрутаў, у тым ліку і самы кароткі транзітны калідор паміж Беларуссю і Кітаем. Там, наколькі вядома, сітуацыя няпростая — Казахстан спачатку зрабіў больш жорсткай праверку грузаў, якія перамяшчаюцца з Паднябеснай у Беларусь і Расію, а нядаўна заявіў аб тым, што ў планах — адмовіцца ад практыкі выкарыстання дазвольных бланкаў.***

— Узаемаадносіны з Казахстанам у сферы грузаперавозак нельга назваць простымі. У апошнія гады абмежаванні для беларускіх і расійскі перавозчыкаў Казахстан часта абгрунтоўваў захаваннем інтарэсаў мясцовых транспартных кампаній, якія не раз звярталіся да ўрада з просьбамі абмежаваць дзейнасць расійскіх і беларускіх перавозчыкаў на тэрыторыі краіны. Прычына ў тым, што мясцоваму бізнесу складана канкурыраваць з рэлакаванымі расійскімі і беларускімі транспартнымі кампаніямі. Таму ў жніўні гэтага года прагучала заява Казахстана аб планах спрасціць сістэму выканання міжнародных аўтамабільных грузаперавозак аж да адмовы ад практыкі выкарыстання дазвольных бланкаў. Гэта было сапраўды нечаканым. Аднак транспартнае ведамства краіны заявіла, што ў гэтым рашэнні кіруецца інтарэсамі дзяржавы і насельніцтва. Спадзяёмся, што гэтак і будзе, бо для Беларусі бездазвольная сістэма перавозак з Казахстанам сапраўды магла б адыграць немалую ролю як ў павелічэнні аб'ёмаў перавозак на гэтым напрамку, так і ў іх патанненні.

## ДА МОРА ПРАЗ ПАКІСТАН

***— Усход становіцца адным з найбольш прывабных напрамкаў. Якія краіны ўключаны ў маршруты перавозак ужо сёння і якія планы і ўмовы супрацоўніцтва з гэтымі краінамі на найбліжэйшы час і на перспектыву?***

— Аб маштабнай рабоце на ўрадавым узроўні па лібералізацыі і спрашчэнні перавозак з краінамі Азіі гаворыць фарміраванне новых транспартных калідораў, напрыклад «Беларусь — Расія — Казахстан — Узбекістан — Афганістан — Пакістан». Усё часцей на парадак дня выходзяць пытанні ўвядзення бездазвольнай сістэмы перавозак з краінамі ўсходняга рэгіёна.

Такія праекты з мінулага года абмяркоўваюцца з Іракам, Катарам, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Саудаўскай Аравіяй, Пакістанам, Арменіяй, Таджыкістанам, Узбекістанам. Сёлета Беларусь і Турцыя падпісалі дакумент, які прадугледжвае ўзаемную адмену віз для грузаперавозчыкаў. Пагадненне ўступіць у сілу пасля праходжання працэдур унутрыдзяржаўных ратыфікацый з абодвух бакоў. Сутнасць яго ў тым, што беларускія кіроўцы змогуць знаходзіцца ў Турцыі (і наадварот, турэцкія — у Беларусі) без віз 90 дзён на працягу кожнага 180-дзённага перыяду. Сёння тэрмін бязвізавага знаходжання абмежаваны 90 днямі ў год.

Гэтым жа летам Беларусь і Пакістан ратыфікавалі Пагадненне аб міжнародных аўтамабільных перавозках паміж краінамі. У ім прадугледжаны і парадак ажыццяўлення міжнародных грузаперавозак, і ўмовы ўзаемнага вызвалення перавозчыкаў ад выплаты мытных пошлін, падаткаў і збораў, звязаных з выкарыстаннем транспартных сродкаў. Рэалізацыя пагаднення дапаможа беларускім кампаніям спрасціць даволі складаныя і дарагія на сёння пастаўкі ў Пакістан. Акрамя таго, праз работу з гэтай краінай Беларусь атрымае выхад да мора — і мы, нарэшце, вырашым складанасці з маршрутамі праз парты Прыбалтыкі, дзе сёння дзейнічаюць санкцыйныя абмежаванні.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

**Фота з архіва Таццяны САЛДАЦЕНКА і адкрытых крыніц.**

# ДЫНАМІКА — СТАНОЎЧАЯ

## Мінэканомікі: выручка на саніраваных прадпрыемствах вырасла ў 1,5-2,5 раза

У Мінску прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Ўрэгуляванне неплацежаздольнасці: тэндэнцыі і перспектывы». Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР, прымаючы ўдзел у яе рабоце, адзначыў, што ў Беларусі сфарміравана дзейсная заканадаўчая база, якая дазваляе захоўваць працоўныя калектывы і вяртаць прадпрыемствы да стабільнай працы.

### ДОЛЯ ЗАДАВОЛЕНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ КРЭДЫТОРАЎ ВЫРАСЛА ДА 41,5 %



Юрый Чабатар нагадаў аб некаторых навелах Закона «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці», якія пашырылі паўнамоцтвы дзяржорганаў у сферы фінансавага аздараўлення. Асаблівы акцэнт — на прэвентыўных мерах і аналізе сітуацыі на месцах.

— Да значных для эканомікі і грамадства арганізацый банкруцтва не ўжываецца. Але, пры неабходнасці, да іх могуць быць ужытыя працэдуры дасудовага фінансавага аздараўлення, — нагадаў ён.

Яшчэ адна важная навацыя, на якую звярнуў увагу профільны міністр, — права выканкамаў ініцыяваць паперэджанне банкруцтва прыватных кампаній як па сваёй ініцыятыве, так і па запыце саміх арганізацый.

— Ужо ёсць прыклады такога ўзаемадзеяння. Трэць саніраваных прадпрыемстваў зайшлі ў судовую працэдуру аздараўлення за апошнія два гады. І ўсе яны прыватныя, — агучыў Юрый Чабатар.

Ён адміняў некалькі трэндаў, назіраемых за перыяд дзеяння новага закона: у прыватнасці, колькасць арганізацый дзяржсектара з высокай рызыкай банкруцтва скарацілася на 2,8 %; выручка на саніраваных прадпрыемствах вырасла ў 1,5-2,5 раза; доля задаволеных патрабаванняў крэдытораў павялічылася з 10 % у 2022 годзе да 41,5 % у першым паўгоддзі 2025-га.

Кіраўнік міністэрства таксама расказаў аб перспектыўных кірунках удасканалення нарматыўнай базы ў гэтай сферы.

